# ЗЯРНЯТКА 30

1 красавіка 2018 г., Вялікдзень, год В

*Езус Назаранін, укрыжаваны, уваскрос* Мк 16, 1-7



Калі мінула субота, Марыя Магдалена і Марыя Якубава, і Саламея купілі пахучыя алеі, каб пайсці і намасціць Езуса. І вельмі рана, у першы дзень тыдня, прыходзяць да магілы, калі ўзышло сонца, і кажуць між сабою: Хто адсуне нам камень ад уваходу ў магілу?

І паглядзеўшы, бачаць, што камень адсунуты, а ён быў вельмі вялікі. І ўвайшоўшы ў магілу, убачылі юнака, які сядзеў з правага боку, апрануты ў белае адзенне, і вельмі спалохаліся.

А ён кажа ім: Не бойцеся. Шукаеце Езуса Назараніна, укрыжаванага; Ён уваскрос, Яго тут няма. Вось месца, дзе паклалі Яго. Але ідзіце, скажыце вучням Ягоным і Пятру: Апярэдзіць вас у Галілеі. Там Яго ўбачыце, як Ён сказаў вам. *Гэта Слова Пана.*



**Аллелюя, аллелюя, аллелюя.**

Дапамажы зайке знайсі кошык з яйкамі.



Размалюй малюнак.

ХРЫСТОС УВАСКРОС!
САПРАЎДЫ ЎВАСКРОС!
АЛЛЕЛЮЯ!